УДК 908

БЕЛАРУСКІЯ КАРАНІ ФЁДАРА МІХАЙЛАВІЧА ДАСТАЕУСКАГА

***А.В. Гарох**, 1 курс*
*Навуковы кіраўнік – **Л.П. Місюкавец**, выкладчык*
Палескі дзяржаўны ўніверсітэт

Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі - адзін з самых значных і вядомых у свеце рускіх пісьменнікаў і мысляроў - нарадзіўся 11 лістапада 1821 года. Род Дастаеўскага не стаіць у тым жа радзе, што і старажытныя дваранскія прозвішчы, да якіх належалі рускія пісьменнікі: Пушкін, Лермантаў, Талсты, Тургенеў. Бацька Дастаеўскага, Міхась Андрэевіч, штаб-лекар лякарні для бедных у Маскве, быў сынам уніяцкага святара, гэта значыць належаў да духоўнага саслоўя. І толькі ў 1827 годзе, калі сыну Фёдару было 6 гадоў, ён даслужыўся да чыну калежскага асэсара, і ў наступным, 1828 годзе быў пераведзены ў дваранскае саслоўе. Дзеці Дастаеўскія народжаны не дваранамі, а сталі імі, паколькі дваранства заслужыў іх бацька [2, с.142].

Ф.М. Дастаеўскі – дваранін толькі ў другім пакаленні. Дастаеўскі нічога і ніколі не казаў пра сваіх продкаў, ніколі не звяртаўся да генеалагічных аргументаў. Найбліжэйшыя продкі, як з боку бацькі, так і з боку маці, былі людзьмі "сярэдняга, цёмнага круга": бурсакі, семінарысты, сядзельцы ў крамах, прыганятыя, купцы, лекары, інтэлігенты-разначынцы. Іх сацыяльны статут – гарадскія мяшчане, сціплыя, небагатыя абывацелі.

Адкуль жа бярэ карані гэты знакаміты род Дастаеўскіх?

Пачаткам адліку гісторыі роду Дастаеўскіх навукоўцы лічаць 6 кастрычніка 1506 года. Менавіта ў гэты дзень Даніла Іванавіч Рцішчаў (згадваны таксама як, Рцішчавіч, Ірцішчавіч, Арцішчавіч) атрымаў ад пінскага князя Фёдара Яраславіча дараваную грамату "вечна і непарушна" на маёнтак Полкацічы і на частку сяла Дастоева ў Пінскам павеце, дзе затым і была збудавана сядзіба роду Дастаеўскіх [1, с. 380].

Тапонім Дастоева па-этымалагічнаму можа быць звязаны са старажытнаславянскім словам "дастой", якое мела значэнне "добрая якасць" і адзначана ў сербскай і славацкай мовах. У рускіх гаворках яго зафіксаваў і ўнёс у свой слоўнік Уладзімір Даль. Назва паселішча мае выгляд прыналежнага прыметніка, што дазваляе меркаваць аб яго ўтварэнні ад гіпатэтычнага старажытна славянскага асабістага імя Дастой, г.зн. "годны" [4, с.172].

Сяло Дастоева было размешчана на паўночным усходзе ад Пінска, паміж рэкамі Пінай і Ясельдай. З тых часоў па тагачаснай традыцыі нашчадкі прынялі прозвішча Дастаеўскія. Мянушка становіцца распаўсюджаным прозвішчам, шматлікія прадстаўнікі якога жылі пазней па ўсёй Беларусі, Украіне і Літве. Асабліва шмат Дастаеўскіх пражывала ў Пінску і яго наваколлях. Сярод іх былі і вельмі знакамітыя, як, напрыклад, маршалак Пінскага павета і член Галоўнага трыбунала Вялікага Княства Літоўскага Пётр Дастаеўскі.

У валоданні Дастаеўскіх сяло Дастоева знаходзілася да трэцяй чвэрці XVII стагоддзя. У XVII стагоддзі казакі Багдана Хмяльніцкага здзейснілі злачынства без пакарання – спалілі маёнтак Дастаеўскіх дашчэнту. Аднавіць згубленае гаспадары так і не змаглі. Калі сядзіба Дастаеўскіх стала раскіданай, яны раз'ехаліся хто куды. Напрыклад, прадзед Ф. М. Дастаеўскага накіраваўся ў Расійскую імперыю, з яго, дарэчы, і пачалася руская галіна ў геніалогіі Дастаеўскіх [1, с. 380].

Яшчэ ў XVIII стагоддзі ў Дастоева стаяла сядзібная хата продкаў пісьменніка. Захаваныя архіўныя дакументы дазволілі ў дэталях аднавіць выгляд усёй сядзібы. Гэта быў значных памераў фальварак, які ўключаў панскі двор, акружаны ровам і плотам, і гаспадарчую частку, злучаную з дваром мостам. У хаце мелася пяць пакояў, невялікая капліца, сенцы і сталовая. Побач знаходзіліся кухня, свіран-лямус з галерэямі і іншыя будынкі. У сядзібе немалое месца займалі два сады і гарод. У гаспадарчую частку ўваходзілі гумно, жывёльны двор, бровар, пабудовы для слуг і двухпавярховая драўляная хата эканома. Галоўны ўезд у сядзібу ўпрыгожвала двухпавярховая вежа з высокім шатровым дахам [4, с.173].

Пазней сядзібай Дастаеўскіх валодалі Стравінскія, Чаплінскія, князі Гедройцы, і толькі з пачатку XIX стагоддзя сваякі знакамітага польскага кампазітара і графіка Напалеона Орды. Рэшткі фальварка ранейшых уладальнікаў Дастоева зніклі пры меліярацыйных працах у 1950-60-ыя гг.

Цікавасць да сваіх каранёў жыве ў кожным з нас. Сур'ёзна цікавіўся гісторыяй свайго роду і Ф. М. Дастаеўскі. Загадкай з'яўлялася для яго лёс яго продкаў па мужчынскай лініі, бо ведаў ён толькі бацьку, які яшчэ ў юнацкасці рэзка адмежаваўся ад сваіх родных і з'ехаў у Маскву. У пяцьдзесят гадоў Ф. М. Дастаеўскі вырашыў адшукаць свае генеалагічныя карані. Жонка пісьменніка А. Г.

ПолесГУ

Дастаеўская 4 лістапада 1897 г. пісала ў Дастоева: "Ф. М. Дастаеўскі шмат разоў казаў мне, што яго род паходзіць з Літвы ад пінскага маршалка Дастаеўскага… Дастаеўскі і яго нашчадкі жылі ў сяле Дастоева". Але нягледзячы на ўсё гэта нага рускага пісьменніка на беларускую зямлю так і не ступіла [3, с. 37].

Праўнук Ф. М. Дастаеўскага Дзмітрый Дастаеўскі ўпершыню наведаў Дастоева 21 красавіка 2007 года па выпадку святкавання 500-годдзя роду Дастаеўскіх. Як паведаміў Анатоль Бурак, гэта першы візіт прадстаўніка роду Дастаеўскіх на радзіму продкаў.

Разам з праўнукам пісьменніка ў вёску прыехалі старэйшы навуковы супрацоўнік літаратурна-мемарыяльнага музея Ф. Дастаеўскага ў Санкт-Пецярбургу Наталля Шварц, маскоўскі даследнік радаводу Дастаеўскіх доктар медыцынскіх навук Мікалай Багданаў, а таксама выкладчык філалагічнага факультэта БДУ кандыдат філалагічных навук Зміцер Башкіраў, які таксама займаецца вывучэннем роду Дастаеўскіх. У планах іх трохдзённага візіту былі: наведванне месца, дзе знаходзіўся маёнтак Дастаеўскіх, школьнага музея, сустрэча з вучнямі сярэдняй школы, якая носіць імя пісьменніка, а таксама ўдзел у навуковай канферэнцыі, прысвечанай жыццю і творчасці класіка рускай і сусветнай літаратуры.

Восенню 2006 года ў горадзе Іванава адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Ф. М. Дастаеўскі і сусветны літаратурны працэс", прымеркаваная да святкавання 500-годдзя знакамітага роду.

Дастоева – гонар усяго Палесся, усёй Беларусі, на зямлі якой раскінулася гэта вёска. Жыхары Дастоева вельмі ганарацца сваёй малой Радзімай. На той самай зямлі ў памяць аб славутай сядзібе Дастаеўскіх яны пасадзілі некалькі дрэў.У вёсцы ёсць вуліца Ф.М. Дастаеўскага, яго імя носіць і мясцовая школа, дзе створаны музей пісьменніка, які быў адкрыты ў 1982 годзе пад пачаткам Анатоля Бурака, самадзейнага мастака Дастоева. На цяперашні момант Анатоль Бурак з'яўляецца захавальнікам фонду літаратурна-краязнаўчага музея ў Дастоеўскай сярэдняй школе. Экспанаты для музея збіралі інтэлігенцыя, вяскоўцы, іх дзеці-школьнікі. Музей класіка літаратуры налічвае больш трох тысяч экспанатаў. Штогод яго наведваюць звыш трох тысяч чалавек. Школьны музей падтрымлівае цесныя сувязі з маскоўскім фондам Дастаеўскага, а таксама з музеямі Дастаеўскага ў Старой Русі і Санкт-Пецярбургу. Таксама ў 1995 годзе ў вёсцы быў адкрыты помнік. Усё гэта зроблена для таго, каб сучасная моладзь памятала пра сваіх продкаў.Таму вяскоўцы запрашаюць наведаць сваю вёску ўсіх, хто хоча даведацца пра гістарычныя карані славутага рускага пісьменніка і прасякнуцца любоўю да гэтай цудоўнай палескай мясціны.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя. Т3, кн.1. Брэсцкая вобласць/ Г 20 рэдкал. Г.П Пашкоў (гал.рэд). [і інш] – Мінск: Бел. Эн, 2006. – 528 с.

2. Гроссман, Л.П. Достоевский / Л.П. Гроссман. – М..: Молодая гвардия, (Жизнь замечательных людей. Серия биографий); Вып. 24, 1962. – 357 с.

3. Достоевская, А.Г. Воспоминания./ А.Г. достоевская. – М.: Художественная литература, 1981. – 253 с.

4. Регионы Беларуси: энциклопедия. В 7т. Т.1, кн. 1 Брестская область/ редкол.: Т.В. Белова (гл. ред) [и др.]. – Минск: Белрус. Энцыкл. Імя П. Броўкі. – 2009. – 520с.

ПолесГУ